# Рылько Алесь
# 1923-1967



Рылько Алесь (Аляксей Іванавіч) — беларускі савецкі пісьменнік.

Нарадзіўся 27 сакавіка 1923 года ў в. Рыдамля Талачынскага раёна.

Скончыў 9 класаў Рыдамльскай школы, педагагічныя курсы ў Оршы (1939г.), Аршанскі настаўніцкі інстытут (1941г.), аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1951г.).

У 1939–1941 гг. працаваў загадчыкам Лявонаўскай пачатковай школы на Аршаншчыне.

У гады Вялікай Айчыннай вайны быў партызанам атрада "Перамога" брыгады К.Заслонава, мінёрам спецгрупы "Непераможныя".

У 1944-1946 гг. настаўнічаў на Пастаўшчыне. Член КПСС з 1949 года.

Працаваў у газетах "Савецкі селянін" (1947-1948гг.) і "Літаратура і мастацтва", часопісах "Вожык" (з 1952 года — загадчык аддзела) і "Полымя".

Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1952 года.

У 1952–1967 гг. — літаратурны кансультант Саюза пісьменнікаў БССР.

Пачаў друкавацца з 1946 года. Першае апавяданне "Сама зразумела" было змешчана ў часопісе "Вожык".

Першы зборнік апавяданняў "Мае сустрэчы" выйшаў у 1952 годзе. Алесь Рылько — аўтар кніг апавяданняў "Мае сустрэчы" (1952г.), "Цвіце чаромха" (апавяданні, п'есы, 1957г.), "Стуканок у аблавушцы" (гумарыстычныя апавяданні, 1959г.), "Ты прыгожая, Арынка" (апавяданні, нарысы, 1960г.), "Напрадвесні" (выбранае, 1984г.), аповесці для дзяцей "Мядовыя краскі" (1959, 1983гг.), аднаактовай п'есы "Гром з яснага неба" (1953г.), "Колькі вяровачку не віць…" (аднаактовая камедыя і сцэнкі, 1958г.). У 1969 годзе выйшаў зборнік "Выбранае". Смерць перапыніла працу над раманам "Срэбныя росы".

Творы А. Рылько перакладзены на балгарскую, польскую, рускую (Ю. Багушэвічам, беларускі пісьменнік, перакладчык), чэшскую і іншыя мовы.

Памёр 16 красавіка 1967 года. Пахаваны ў Мінску.

# Дадатковыя матэрыялы аб жыцці і дзейнасці:


1. **Алесь (Аляксей Іванавіч) Рылько** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна / рэдкал. : І.П. Шамякін і інш. ; мастак А.М. Хількевіч. — Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1988. — С. 646.
2. **Алесь Рылько** и Евгений Василёнок // В атмосфере художественного поиска и стилевого многообразия: творчество витебских литераторов во второй половине 1960-х — начале 1990-х годов : монография : в 2 ч. / А.В. Русецкий, Ю.А. Русецкий. — Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2012. — Ч. 1. — С. 116–120.
3. **Астаецца сагрэтае сэрцам** // Цеплыня чалавечнасці : нарысы, літаратурныя партрэты, артыкулы / Г. Шупенька. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1977. — С. 143–151.
4. **Бялевіч, Л.А.** Рылько Алесь / Л.А. Бялевіч // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / рэдкал. : І.Э. Багдановіч [і інш.]. — Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1995. — Т. 5 : Пестрак–Сяўрук. — С. 186.
5. **Караткевіч, В.Б.** Радзіма Рылько Алеся (Рыдамля) / В.Б. Караткевіч // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / рэдкал. : С.В. Марцэлеў [і інш.]. — Мінск : БелСЭ імя П. Броўкі, 1985. — С. 418.
6. **Карніловіч, Э.** “Гром з яснага неба” / Эдуард Карніловіч // Наша Талачыншчына. — 2013. — 10 жніўня. — С. 5.
7. **Лирик, сатирик, юморист** // Моя Толочинщина: страницы истории / Анатолий Шнейдер. — 2-е изд, с изм. — Минск : Бизнесофсет, 2006. — С. 140–141.
8. **Рылько Алесь** (Алексей Иванович) // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол. : Т.В. Белова [и др.]. — Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2011. — Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. — Кн. 2. — С. 426–427.
9. **Рылько Алесь** (Аляксей Іванавіч) // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал. : Г.П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2001. — Т. 13 : Праміле-Рэлаксін. — С. 499.
10. **Яроменка, М.** Яго думка і сэрца не ведалі спакою / М. Яроменка // Сцяг Ільіча (Талачын). — 2001. — 6 студзеня. — С. 2.


# Інтэрнэт-рэсурсы:


1. **Алесь Рылько** : [Элетронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://be.wikipedia.org/wiki. — Дата доступу : 01.11.2022.
2. **Алесь Рылько** — белорусский драматург, писатель, прозаик, публицист : [Элетронный ресурс]. — Режим доступа : https://nashi-lyudi.by/person/ales-rylko/. — Дата доступа : 01.11.2022.
3. **Рылько Алесь** : [Элетронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://pridvinie.vlib.by/index.php/mtree-lib/pismenniki-paety-litaratary/rylko-ales. — Дата доступу : 01.11.2022.